**А. Захарэвіч**
*Беларускі дзяржауны універсітэт*

# ЭСТЭТЫЗАЦЫЯ БРЫДКАГА: МАРАЛЬНЫЯ НАСТУПСТВЫ

У галерэях сучаснага мастацтва трэба прапаноўваць пакецікі, якія даюцца пасажырам самалётаў. Тыповы прадстаўнік сучаснага візуальнага мастацтва – аўтар інсталяцый “анатомія смецця” і “метамарфозы фекалій”, які падпісвае свае працы слінай і спермай. І я безумоўна магу абвінаваціць яго ў неэстэтычнасці і амаральнасці, але ж ягоныя выставы папулярныя! Уваход каштуе немалыя грошы, а каб трапіць на адкрыццё – трэба паклапаціцца пра білеты мінімум за некалькі тыдняў. Як вядома, попыт нараджае прапанову. Так што, чым больш будзе аматараў смеццевай анатоміі, тым больш будуць з’яўляцца і падобныя інсталяцыі.

Было б несправядліва, аднак, сцвярджаць, што эстэтызацыя брыдкага ў мастацтве практыкуецца толькі апошнія пару-тройку дзясяткаў гадоў. Феномен антымастацтва – вынік эстэтызацыі брыдкага ў мастацтве, – вядомы столькі ж, колькі і само мастацтва. У розных культурах існавалі і існуюць розныя ўяўленні пра брыдкае, і надаюцца брыдкаму розныя ролі ў мастацтве. Асаблівае месца займае праблема брыдкага ў хрысціянскай этыцы. Хрысціянскія мысляры высока цанілі бачную прыгажосць свету і чалавека, але сцвярджалі, што нават брыдкі знешні выгляд можа спалучацца з унутранай прыгажосцю. На аснове гэтага тэзісу развілася эстэтыка аскетызму хрысціянскіх манахаў. [2]

Брыдкае можа быць мастацкім вобразам менавіта ў якасці брыдкага. Гэты феномен уласцівы для твораў на актуальныя сацыяльна-праблемныя тэмы. Мастак выступае транслятарам, які агалошвае праблему. Нярэдка індывід супраціўляецца негатыўнай сацыяльна істотнай інфармацыі, прымаючы пазіцыю “я пра гэта нічога не ведаю, а значыцца, гэтага не існуе”. Ён жыве ў сваёй зоне камфорту, з якой яго неабходна выкінуць.

Мастацтва трансфармуецца – і гэта нармальна. Змяняюцца формы, акцэнты і вобразы. Адмаўляць каштоўнасць пэўных мастацкіх твораў толькі таму, што асобна ўзятаму індывіду гэтыя творы падаюцца “няправільнымі” – недапушчальна. Але на ўваходзе ў сучасныя галерэі варта ўсё-ткі прапаноўваць пакецікі. І ў кінатэатрах таксама.

Сімвал нашай эпохі – эўфемізм. Мы ўжо даўно не называем шматлікія рэчы сваімі імёнамі. Выкарыстоўваючы эўфемізмы, мы эстэтызуем брыдкае. Аднак мы не заяўляем адкрыта, што брыдкае ёсць прыгажосць. Мы хаваем уродлівасць за шырмай – нейтральным па сэнсе словам і атаесамляем брыдкасць з шырмай. Але мы не прызнаем нейтральнае брыдкім, не. Наадварот, мы сцвярджаем, што брыдкасць – гэта аніякая не брыдкасць, а ўсяго толькі нейтральнае, альбо нават пазітыўнае паняцце.

Безумоўна, для эстэтызацыі брыдкага неабходна вызначыць для сябе, што ёсць брыдкае ў побыце. Калі адносна мастацтва мы кажам пра брыдкае як пра пра не-цудоўнае, то адносна штодзённасці варта вызначаць брыдкае як не-карыснае. [1] Канешне, гэта вельмі спрошчаная мадэль, але яна дазваляе ўбачыць некаторыя акцэнты. Адназначна надаць карысці статус вызначальнага фактара ў адмежаванні цудоўнага і брыдкага не дазваляе той факт, што карысць – гэта адносная, а не абсалютная велічыня.

Яшчэ адзін спосаб эстэтызацыі брыдкага – гэта сталае разуменне і ўзважанае асэнсаванне таго, што пэўная з'ява, якую мы раней трактавалі як брыдкасць, такой не з'яўляецца. Такі тып эстэтызацыі лёгка адслежваецца ў нормах паліткарэктнасці, забароне дыскрымінацый, адмаўлення ад цэнзуры.

Самі па сабе маральныя наступствы эстэтызацыі брыдкага я прапаноўваю падзяліць на пазітыўныя і негатыўныя. Да пазітыўных маральных наступстваў варта аднесці развіццё эмпатыі, (сама)вызваленне ад забабонаў, забарона дыскрымінацыі. Страх перад негатыўнымі маральнымі наступствамі эстэтызацыі брыдкага не пакідае шанцаў пазітыўным наступствам і замінае шырокай прапагандзе гуманізму. У выніку грамадства з жахам сутыкаецца з сітуацыяй атрафіі шэрагу маральных пачуццяў, і перад ім узнікаюць новыя і новыя праблемы. Аднак, негатыўных наступстваў эстэтызацыі брыдкага і праўда варта баяцца, бо да іх шэрагу адносяцца змена каштоўнасных арыенціраў і духоўных ідэалаў. Змяняюцца асноўныя прынцыпы камунікацыі, базавыя ўяўленні пра дабро і зло, трансфармуюцца формы і мадэлі ўзаемаадносінаў індывідаў.

---

1. http://www.taby27.ru/manager/index.php?a=4&pid=4 - _ftnref1 Этика: Словарь. Под ред. А.А. Гусейнова и И.С, Кона. – М.: Политиздат. – 2001.
2. *Яковлев, Е.Г.* Эстетическое сознание, искусство и религия / Е.Г Яковлев – М: Искусство. – 1969. – 170 с.